Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 6. Варыянт 4**

**Білет 6. Практычнае заданне. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х - 1980-я гг.**

**Заданні склала:**Свірыд Жанна Антонаўна, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Сярэдняя школа №2 г. п. Карэлічы»

**<u>На аснове прадстаўленых матэрыялаў, адкажыце на пытанні:</u>**

Пытанні і заданні 1. Аб якім асноўным законе БССР гаворыцца ў крыніцы 3?

2. Вызначце, якія асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця савецкай Беларусі другой паловы 1940-х – 1980-я гг. адбіліся ў Дзяржаўным гімне БССР.

3. З апорай на крыніцы 1 і 3 ахарактарызуйце грамадскую актыўнасць беларускага народа ў названы перыяд.

4. Растлумачце, якую ролю адыгрывала Камуністычная партыя ў грамадска-палітычным жыцці БССРу другой палове 1940-х - 1980-я гг.

| Крыніца 1.Дэманстрацыя працоўных горада Мінска. Фотаздымак 1976 г. | Крыніца 2. Гімн БССР 1956–1991гг. |
| --- | --- |
|  | Мы – беларусы, з братняй Руссю<br>Разам шукалі да шчасця дарог,<br>У бітвах за волю, у бітвах за долю<br>З ёю здабылі мы сцяг перамог!<br><br>Нас аб'яднала Леніна імя,<br>Партыя да шчасця вядзе нас у паход.<br>Партыі слава! Слава Радзіме!<br>Дзякуй табе, Беларускі народ! |



Крыніца 3.

**Дакумент «З даклада П.М. Машэрава на нечарговай дзевятай сесіі Вярхоўнага Савета БССР, прысвечанай вынікам усенароднага абмеркавання праекта Канстытуцыі БССР у 1978 г.»**

"З першага і да апошняга дня гэтай важнай палітычнай кампаніі працаўнікі гарадоў і вёсак праявілі высокую актыўнасць, сапраўдную зацікаўленасць у тым, каб Асноўны Закон БССР абвяшчаў і замацоўваў усе найбольш істотныя і важныя бакі нашых дасягненняў і заваёў у брацкай сям'і савецкіх народаў, забяспечваў новыя магчымасці для эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу рэспублікі.....

…Усяго было праведзена больш за 70 тыс. сходаў, у якіх прынялі ўдзел каля 6 млн.чал. Пры абмеркаванні праекта выступіла звыш 327 тыс. чал. Яны ўнеслі больш за 330 тыс. прапаноў і заўваг…

Рабочыя і калгаснікі, інтэлігенцыя рэспублікі ўсе свае намеры і імкненні звязваюць з мудрасцю і дзейнасцю роднай Камуністычнай партыі, стваральнай сілай

яе ўнутранай і знешняй палітыкі. Камуністы, увесь беларускі народ з асаблівым задавальненнем успрынялі палажэнне новай Канстытуцыі БССР аб тым, што "кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза".